Источник: “Краязнаўчая газета” – 2014-08-07

# Што бачна праз фотааб’ектыў…

29 ліпеня ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшоў творчы вечар «Фотограф щёлкает…» Наталлі Купрэвіч, прымеркаваны да юбілею фотажурналісткі.

Наталля Юр’еўна нарадзілася ў Мінску. Па спецыяльнасці – інжынер лясной гаспадаркі са спецыялізацыяй «азеляненне населеных месцаў». Працавала на розных пасадах у праектнай установе «Леспраект», Інстытуце батанікі НАН Беларусі, міністэрствах прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, лясной гаспадаркі. Скончыла аспірантуру Інстытута батанікі НАН Беларусі па спецыяльнасці «батаніка».

Яшчэ з дзяцінства Наталля Юр’еўна захапляецца маляваннем, ігрой на фартэпіяна, фота- і кіназдымкамі, рыбалкай, удзельнічала ў спаборніцтвах па розных відах спорту. Вельмі цікавіцца музыкай, тэатрам, выяўленчым мастацтвам, аўтэнтычнай беларускай культурай, фальклорам і краязнаўствам.

Першая навуковая публікацыя выйшла ў зборніку навуковых працаў БТІ, першы артыкул у СМІ – у газеце «Вечерний Минск» у перыяд вучобы ў ВНУ. Апублікавала 2 манаграфіі і больш за 45 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, з’яўляецца навуковым рэдактарам беларускага батанічнага слоўніка.

Фотажурналістыкай пачала займацца як пазаштатны карэспандэнт «Краязнаўчай газеты» Беларускага фонду культуры. За апошнія 5 гадоў у СМІ Н. Купрэвіч апублікавала больш за 300 артыкулаў. Фотаздымкі аўтара адлюстроўваюць культурныя мерапрыемствы краіны, у тым ліку тыя, што ладзяцца дзяржаўнымі літаратурнымі музеямі, Нацыянальным гістарычным і Нацыянальным мастацкім музеямі, Нацыянальнай бібліятэкай і навуковай бібліятэкай НАН Беларусі і інш.

Персанальныя фотавыстаўкі Н. Купрэвіч: «Адлюстраванне» (мастацкая галерэя Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, Мінск, 2004 г.); «О любоў мая, Беларусь» (галерэя «Славутыя майстры», Мінск, 2005 г.); «Фотаасарці» (галерэя фотаклуба «Мінск», 2010 г.).

Праграма юбілейнага вечара складалася з прэзентацыі фотапраекта «Фотограф щёлкает…». У мерапрыемстве ўзялі ўдзел галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» і старшыня БФК Уладзімір Гілеп, галоўны рэдактар рэдакцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё паэт Навум Гальпяровіч, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» літаратар Таццяна Сівец, паэтка Ніна Загорская, фальклярыст, кіраўнік Школы традыцыйнага танца Мікола Козенка, сябры Беларускага саюза мастакоў Дзмітрый Сарока і Сяргей Савохін, фотажурналіст Яўген Пясецкі і іншыя.